www.gazeta.bsu.by

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

3 чэрвеня 2005 года, № 12 (1920)

СУПРАЦОЎНІЦТВА

ЛІСТ З ПОЛЬШЧЫ

Як паведамляў "Беларускі універсітэт" (№10 за 3 мая 2005 г.), напярэдадні святкавання 60-годдзя Перамогі група беларускіх студэнтаў на чале з прарэктарам па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Суворавым займалася ўпарадкаваннем пахаванняў савецкіх воінаў у Пултуску (Польшча). Нядаўна ў наш універсітэт прыйшоў ліст ад Адама Касэскага — рэктара Вышэйшай гуманітарнай школы імя Аляксандра Гейштара, размешчанай у Пултуску.

Спадар рэктар!

У адпаведнасці з нашымі папярэднімі дамоўленасцямі 18—21 красавіка нас наведалі 5 студэнтаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта з Мінска на чале з прарэктарам. Нашыя госці правялі два працоўныя дні на аднаўленні пахавання — помніка савецкім салдатам, якія загінулі ў змаганні за Пултуск у 1945 г. Плячом да пляча з трыма калегамі-расіянамі з Калінінградскага дзяржаўнага універсітэта, а таксама з польскімі калегамі з Вышэйшай гуманітарнай школы імя Аляксандра Гейштара яны зрабілі вялікі аб'ём працы, выказваючы ўдзячнасць героям за вызваленне нашых земляў з-пад гітлераўскай акупацыі і гэтым самым даючы прыклад патрыятызму і грамадзянскага клопату пра месцы народнай памяці як нашым студэнтам, так і ўсёй тутэйшай супольнасці.

Вашы студэнты паказалі сябе людзьмі адукаванымі, культурнымі, адказнымі як у працы, так і падчас адпачынку. Асабліва хочацца падкрэсліць іх добрае валоданне польскай мовай. Выказваем надзею, што як спадар прарэктар, так і студэнты будуць з цеплынёй узгадваць візіт у Пултуск.

Са свайго боку хочам выказаць перакананне, што гэты кароткі візіт пацвярджае нашую думку пра шырокія магчымасці плённага супрацоўніцтва паміж нашымі навучальнымі ўстановамі.

З павагай,
рэктар прафесар Адам КАСЭСКІ

ПОМНІКІ БДУ



«Беларускі універсітэт» працягвае знаёміць чытачоў з выдатнымі беларускімі дзеячамі і асветнікамі, скульптуры якіх размешчаны ва універсітэцкім дворыку. У гэтым нумары чытайце пра Еўфрасінню ПОЛАЦКУЮ. (Стар. 3)

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПЕРАМОЖЦЫ З МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА — Стар. 3

ВЯЛІКІ "КОШЫКБОЛ" НА ФІЛФАКУ — Стар. 4

САМЫЯ ЎТУЛЬНЫЯ

Вынікі конкурсу «Найлепшы пакой інтэрната БДУ» — Стар. 4

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

С.В. ДУБОВІК: "БЫЦЬ СУМЛЕННЫМ У ДАЧЫНЕННІ І ДА ДЗЯРЖАВЫ, І ДА ЛЮДЗЕЙ, І ДА СВАЁЙ ПРАФЕСІІ..."

Пра ўзровень падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у краіне, пра тое, якім павінен быць сучасны журналіст, якія змены чакаюцца ў бліжэйшыя гады на факультэце журналістыкі, пра перспектывы развіцця журналісцкай адукацыі ў Беларусі рэдактар газеты "Беларускі універсітэт" гутарыць з новым дэканам факультэта журналістыкі БДУ, дацэнтам Сяргеем Валянцінавічам ДУБОВІКАМ.

— Сяргей Валянцінавіч, якім Вы ўяўляеце сабе сучаснага журналіста?

— Думаю, сучасны журналіст — гэта, у першую чаргу, чалавек, які сумленна выконвае свой прафесійны абавязак, заўсёды становіцца на бок простага чалавека. Журналіст павінен быць духоўным, чалавечным, імкнуцца прыйсці на дапамогу іншым людзям, пісаць толькі праўду. Калі казаць пра прафесійныя якасці, ён павінен быць высокаадукаваным, ведаць сучасныя камп'ютарныя тэхналогіі, замежныя мовы, быць аператыўным, мабільным, камунікабельным, напорыстым.

— Як Вы ацэньваеце цяперашнюю якасць падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у краіне? Ці можаце параўнаць якасць падрыхтоўкі айчынных і замежных журналістаў? Чаго, на Ваш погляд, не хапае сённяшняму выпускніку журфака?

— Самы вялікі недахоп, на маю думку, пры падрыхтоўцы журналістаў за апошнія гады — гэта недастатковая практыка. Рэдактары вядучых СМІ звяртаюць увагу, што пасля навучання да іх часам прыходзяць маладыя людзі, якіх яшчэ доўга трэба вучыць на практыцы. Наша задача сёння — максімальна наблізіць навучанне будучых журналістаў да практыкі. Ужо з наступнага навучальнага года гэтая праца пачнецца: з'явяцца філіялы кафедраў факультэта на базе вядучых беларускіх СМІ, са студэнтамі будуць працаваць не толькі нашы выкладчыкі, але і журналісты-практыкі. У гэтым зацікаўлены і самі кіраўнікі СМІ, таму што падчас такога навучання яны змогуць падабраць сабе будучых спецыялістаў і запрасіць іх на працу пасля заканчэння вучобы.

Яшчэ адна з праблем факультэта — матэрыяльна-тэхнічная база. Каб на належным узроўні рыхтаваць спецыялістаў-журналістаў, асабліва для радыё і телебачання, неабходна забяспечыць нашы лабараторыі сучасным абсталяваннем. Рэктар БДУ В.І. Стражаў абяцаў факультэту дапамагчы набыць неабходную тэхніку для кафедры тэлебачання і радыёвяшчання. Самі мы таксама шукаем магчымасці палепшыць сітуацыю. Напрыклад, Беларускае радыё і Першы нацыянальны тэлеканал плануюць перайсці на лічбавае вяшчанне і будуць мяняць абсталяванне. Сёння мы вядзём перамовы з кіраўніцтвам Белдзяржтэлерадыёкампаніі, каб яны перадалі факультэту старое абсталяванне, якое паспяхова можна выкарыстоўваць у навучальным працэсе.

Наконт падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў у іншых краінах. Калі я быў дэпутатам Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі, працаваў у камісіі па інфармацыйнай палітыцы, у мяне была магчымасць бываць і ў Маскве, і ў Кіеве, гутарыць з журналістамі розных узроўняў. Якасць адукацыі нашых журналістаў не ніжэйшая, чым у выпускнікоў факультэта журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта. Іншая справа, што нашаму журналісту сёння крыху не хапае такой хваткі, якая ёсць у маскоўскіх. Амаль кожны расійскі журналіст ведае сабе цану. Там друкуецца шмат замоўленых, "праплачаных" артыкулаў. Беларуская журналістыка больш чыстая, шырока такой тэндэнцыі ў нас пакуль што не назіраецца. Нашы журналісты, асабліва тыя, хто атрымаў дыплом факультэта журналістыкі БДУ, адчуваюць большую адказнасць за напісанае, вымаўленае слова, у іх вышэй, так бы мовіць, планка дзяржаўнасці.

Ва Украіне журналістыка, на маю думку, падзелена на дзве часткі — Захад і Усход. Нават падрыхтоўка журналісцкіх кадраў вядзецца ў двух цэнтрах — Львоў і Кіеў. І дзяржава прымае мінімальны ўдзел у падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў дзяржаўніцкай накіраванасці.

Як дэкан лічу сваёй задачай працягваць выхоўваць нашых студэнтаў у духу дзяржаўнасці, адданасці сваёй краіне, праўдзівасці, выканання кодэксу гонару журналіста.

— Міністэрства адукацыі і Міністэрства інфармацыі зацвердзілі Комплексную праграму "Развіццё журналісцкай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь". Якія асноўныя мэты і задачы гэтай праграмы? Якія асноўныя мерапрыемствы яна ўключае?

— Падрыхтоўка журналісцкіх кадраў сёння — гэта прыярытэтны кірунак і ў Міністэрстве інфармацыі, і ў Міністэрстве адукацыі. Сведчанне гэтаму — Комплексная праграма "Развіццё журналісцкай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь", распрацаваная і зацверджаная Міністэрствам адукацыі сумесна з Міністэрствам інфармацыі.

Напрыклад, нарматыўнае прававое забеспячэнне развіцця журналісцкай адукацыі прадугледжвае распрацоўку дакументаў, якія вызначаюць адзіныя падыходы і патрабаванні да журналісцкай адукацыі, у тым ліку прагноз патрэбаў у журналісцкіх кадрах на перспектыву, прапановы па структуры факультэта журналістыкі БДУ, а таксама рэгіянальных ВНУ. Вялікіх змен на факультэце, я думаю, не адбудзецца. Але структура крыху зменіцца: ён будзе адаптаваны да сённяшніх патрабаванняў практычнай журналістыкі. З 1 верасня пад маім

(Заканчэнне на 2-й стар.)

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

3 чэрвеня 2005 года, № 12 (1920)

ВІНШУЕМ!

У БАЛГАРЫЮ — ПА ПЕРАМОГУ!

Рэспубліканская студэнцкая алімпіяда па матэматыцы завяршылася бліскучай перамогай студэнтаў БДУ: навучэнцы факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі атрымалі 6 з 7 дыпломаў вышэйшай ступені, 3 з 5 дыпломаў другой ступені і 1 дыплом трэцяй ступені.

Алімпіяда, якая сабрала 123 удзельнікі з 27 ВНУ Беларусі, адбылася 18—20 мая. Наш універсітэт увайшоў у групу "А", дзе спаборнічалі студэнты класічных і педагагічных ВНУ. З пераможцаў сёлетняй алімпіяды будзе сфарміраваная каманда на Міжнародную студэнцкую алімпіяду па матэматыцы, якая адбудзецца гэтым летам у Балгарыі.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ПОСТФАКТУМ

КАНФЕРЭНЦЫЯ СТУДЭНТАЎ І АСПІРАНТАЎ

18—20 мая прайшла 62-я навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На адкрыцці канферэнцыі выступіў начальнік упраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі К.М. Каросцік.

З дакладамі выступілі прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, доктар гістарычных навук У.К. Коршук ("Беларусь — рэспубліка-партызанка"); студэнтка геаграфічнага факультэта В. Дзянісава ("Рэгіянальныя дэмаграфічныя даследаванні ў рамках студэнцкай навукі (да 20-годдзя СНДЛ рэгіянальных і дэмаграфічных праблем)"); прафесар кафедры тэарэтычнай фізікі, доктар фізіка-матэматычных навук А.В. Мінкевіч ("Тэорыя Вялікага выбуху і сучасная касмалогія"). Усяго на факультэтах БДУ была арганізавана работа 146 секцый, быў зачытаны 1881 даклад. Больш падрабязную інфармацыю пра 62-ю канферэнцыю можна знайсці на сайце аддзела НДРС (http://nirs.bsu/).

Паводле інфармацыі ўпраўлення падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі

ПАДВЕДЗЕНЫ ВЫНІКІ ВІКТАРЫНЫ

Камісія па падвядзенні вынікаў віктарыны, прысвечанай 60-годдзю Перамогі, абвясціла вынікі. Першае месца дасталося студэнту факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Д. Новіку і навучэнцы ліцэя БДУ Ю. Лук'яновіч. На другім месцы апынуўся студэнт геаграфічнага факультэта А. Глушцоў, на трэцім — студэнтка філалагічнага факультэта Н. Кечко.

Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю, Студэнцкі саюз БДУ дзякуюць усім удзельнікам віктарыны і віншуюць яе пераможцаў.

Святлана ДАЛГАНЮК

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

С.В. ДУБОВІК: "БЫЦЬ СУМЛЕННЫМ У ДАЧЫНЕННІ І ДА ДЗЯРЖАВЫ, І ДА ЛЮДЗЕЙ, І ДА СВАЁЙ ПРАФЕСІІ..."

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

кіраўніцтвам пачне працаваць новая кафедра — тэорыі і метадалогіі журналістыкі.

Неабходна будзе зацвердзіць Палажэнне аб правядзенні штогадовай Рэспубліканскай алімпіяды "Абітурыент журфака", Палажэнне аб Апякунскім савеце факультэта журналістыкі БДУ, парадак замяшчэння пасад прафесарска-выкладчыцкага складу з ліку практычных работнікаў, праграму павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі журналісцкіх кадраў, а таксама прадугледжваецца ўнесці змены ў Палажэнне аб практыцы студэнтаў-журналістаў, каб за гады навучання максімальна наблізіць іх да будучай працы. Таксама будзе створана ўзгодненая нарматыўная база па стандарты-

зацыі ў сферы журналісцкай адукацыі.

Для ўдасканалення навучальна-выхаваўчага працэсу неабходна актыўна ўкараняць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі з выкарыстаннем інфармацыйных, камп'ютарных тэхналогій і Інтэрнэту, стварыць майстаркласы працы са студэнтамі з прыцягненнем вопытных журналістаў-практыкаў.

Адзін з найважнейшых блокаў Комплекснай праграмы — навукова-метадычнае забеспячэнне. Будзе створана сістэма крытэрыяў ацэнкі якасці навучальнай літаратуры, фінансавання прыярытэтных кірункаў навукова-даследчай работы ў сферы журналістыкі.

На жаль, у Беларусі дагэтуль няма сур'ёзнага нацыянальнага падручніка па журналістыцы, па якім можна было б навучаць студэнтаў. Комплекснай праграмай прадугледжана бліжэйшым часам абвясціць конкурс і стварыць падручнік "Тэорыя і практыка сучаснай журналістыкі". Гэты падручнік павінен ахопліваць усе аспекты журналісцкай адукацыі і ўключаць раздзелы па тэорыі, методыцы, жанрах журналістыкі, дызайне газеты, менеджменце сучаснай журналістыкі, рэкламе і г.д. А падрыхтаваць яго маглі б выкладчыкі факультэта журналістыкі і аўтарытэтныя спецыялісты ў кожным з гэтых кірункаў, прозвішчы якіх не выклікалі б пытанняў па сваёй прафесійнай кампетэнтнасці, практыкі, якія дасканала ведаюць сваю сферу. Напрыклад, пра менеджмент у журналістыцы мог бы расказаць рэдактар самай масавай і паспяховай газеты краіны "Советская Белоруссия" Павел Якубовіч. Ужо ў верасні мы абвесцім конкурс на стварэнне падручніка, сфарміруем аўтарскі калектыў і будзем працаваць.

Калі казаць пра кадравае забеспячэнне, то варта зазначыць, што будуць прадугледжаны стажыроўкі для прафесарска-выкладчыцкага складу ў дзяржаўных СМІ на пасадах намеснікаў рэдактараў, загадчыкаў аддзелаў.

Таксама Комплекснай праграмай прадугледжваецца палепшыць матэрыяльна-тэхнічную базу факультэта. Сёння для нас адной з хвалюючых праблем з'яўляецца адсутнасць плошчаў. Таму згодна з праграмай мяркуецца завяршыць будаўніцтва навучальнага корпуса па вул. Кальварыйскай, дзе і размесціцца факультэт.

— У праграме гаворыцца пра стварэнне Апякунскага савета факультэта журналістыкі БДУ. Хто можа туды ўвайсці? Каго Вы бачыце ў якасці старшыні гэтага Савета?

— Апякунскі савет, на маю думку, можа вельмі дапамагаць у працы. І мне як кіраўніку факультэта вельмі важна зверыць з паважаным саветам сваю працу, параіцца, папрасіць падтрымкі пры вырашэнні актуальных для факультэта праблем. Гэта павінен быць такі Апякунскі савет, да якога будуць прыслухоўвацца не толькі ў нас ва універсітэце, але ва ўсёй краіне, на ўсіх узроўнях — і ў Адміністрацыі прэзідэнта, і ў Савеце Міністраў, і ў Міністэрстве адукацыі... Зыходзячы з гэтага неабходна фарміраваць яго склад. На маю думку, туды павінны ўвайсці кіраўнікі вядучых сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, вучоныя не толькі ў галіне журналістыкі, але палітолагі, гісторыкі.

— Сяргей Валянцінавіч, да таго, як стаць дэканам факультэта журналістыкі, Вы набылі вялікі вопыт і арганізатарскай, і журналісцкай працы. Пэўны час Вы былі галоўным рэдактарам газеты "Рэспубліка", дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь... Раскажыце больш падрабязна пра Ваш шлях у журналістыцы.

— Першая заметка была надрукавана ў піянерскай газеце "Зорька", калі я быў яшчэ ў 6-м класе. Яна называлася "Ведаю, заўтра мы станем касманаўтамі". З гэтага часу пачаў актыўна супрацоўнічаць з раённай газетай "Слава працы" Капыльскага раёна, адкуль я родам. Друкаваўся ў газетах "Звязда", "Чырвоная змена", "Знамя юности" і інш. Пасля заканчэння Доктаравіцкай сярэдняй школы ў 1969 г. вырашыў паступаць на факультэт журналістыкі БДУ. На жаль, не дабраў аднаго бала — і не паступіў. Год працаваў у раённай газеце. Скончыў філалагічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педінстытута па спецыяльнасці "руская, беларуская мова і літаратура". Усе 5 гадоў навучання быў рэдактарам факультэцкай газеты. А кожнае лета працаваў у роднай раёнцы. Пасля вучобы ўзначаліў сельскагаспадарчы аддзел валожынскай раённай газеты. Прыйшлося ўдзельнічаць і ў афганскіх падзеях: быў нампалітам, камандзірам сапёрнай роты, адказным сакратаром газеты 201-й мотастралковай дывізіі. Пасля арміі працаваў нейкі час настаўнікам, завучам, дырэктарам школы. Але журналістыка вабіла больш. Уладкаваўся карэспандэнтам у газету "Мінская праўда", потым перайшоў у "Рэспубліку". Працаваў прэс-сакратаром прэм'ер-міністра Беларусі. У 1995 г. быў прызначаны галоўным рэдактарам газеты "Рэспубліка".

Нават калі ў 2000 г. па Капыльскай выбарчай акрузе № 82 я быў абраны дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, то працаваў у камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. Займаўся пытаннямі інфармацыйнай бяспекі, прымаў актыўны ўдзел ў працы над зменамі і дапаўненнямі ў "Закон Рэспублікі Беларусь аб сродках масавай інфармацыі". На жаль, іх яшчэ не прынялі. Папярэдні Закон быў прыняты 10 гадоў таму, за гэты час шмат што змянілася. Хутка развіваюцца электронныя сродкі масавай інфармацыі, у тым ліку і масмедыя Інтэрнэту. З'явілася шмат новых тэлеканалаў, радыёстанцый.

Можна сказаць, што мне давялося прайсці шлях ад працы ў раённай газеце да пасады галоўнага рэдактара адной з вядучых рэспубліканскіх газет. Паспрыяў і вопыт працы ў якасці парламентарыя менавіта ў камісіі, якая займалася пытаннямі СМІ. Усё гэта мне дапамагло зразумець, што галоўная задача журналіста і журналістыкі — праўдзіва адлюстроўваць жыццё, дапамагчы людзям разабрацца ў сённяшняй няпростай сітуацыі, быць сумленным у дачыненні і да дзяржавы, і да людзей, і да сваёй прафесіі.

— Каго Вы можаце назваць сваімі настаўнікамі ў журналістыцы? Якія тэмы Вас найбольш цікавяць як журналіста? Успомніце, калі ласка, якія-небудзь незвычайныя сітуацыі з журналісцкага вопыту...

— Калі казаць пра настаўнікаў у журналістыцы, успамінаюцца тыя людзі, якія сустрэліся на пачатку журналісцкага шляху. Да сённяшняга дня я падтрымліваю адносіны з былым галоўным рэдактарам капыльскай раённай газеты, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, кавалерам шматлікіх ордэнаў і медалёў Віктарам Адамавічам Семянкевічам, які мяне запрасіў на працу пасля школы. Мне шанцавала з калегамі ў розных выданнях.

А тэмы мяне цікавілі розныя. Пісаў і пра сельскую гаспадарку, і пра сацыяльна-побытавыя праблемы людзей. Гэта тыя пытанні, якія мне прыйшлося вырашаць ужо дэпутатам. Займаўся і праблемамі эканомікі, нават скончыў эканамічны факультэт Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і атрымаў спецыяльнасць эканаміста-менеджэра.

Калі я яшчэ быў дэпутатам, абараніў кандыдацкую дысертацыю па журналістыцы ў БДУ. Цяпер працую над доктарскай — гэта будзе навуковая праца пра трансфармацыю СМІ ў сучасных умовах. Ужо выйшла манаграфія пад назвай "СМІ постсацыялістычнай Беларусі: пошук новай рацыянальнасці".

Калі просяць успомніць якія-небудзь сітуацыі з журналісцкага вопыту, адразу ўзгадваецца вопыт ваеннай журналістыкі ў Афганістане: пастаянныя камандзіроўкі, баі, верталёты, сустрэчы з салдатамі дзе-небудзь у гарах... Некалькі разоў трапляў у засады, прыходзілася адстрэльвацца. Падчас адной з такіх засад мы здолелі адбіцца, а ў душманаў былі вялікія страты. За гэта мяне ўзнагародзілі ордэнам "За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР III ступені", яшчэ за Афганістан я атрымаў медаль "За баявыя заслугі". Галоўнае, што вынес з Афганістана: тыя людзі, у якіх ёсць стрыжань, якія маюць маральныя якасці, — сапраўдныя людзі, яны нідзе не ламаюцца і застаюцца людзьмі ў любой жыццёвай сітуацыі.

— Як сёлета прайшло размеркаванне выпускнікоў факультэта журналістыкі?

— Пры размеркаванні факультэт задаволіў усе заяўкі газет, радыё, тэлебачання. Некаторыя выпускнікі, што навучаліся за ўласныя сродкі, таксама выказалі жаданне размеркавацца, мы ім дапамаглі. Але ў краіне існуе праблема забеспячэння журналісцкімі кадрамі рэгіянальных СМІ. Ёсць раёны, дзе выпускніка факультэта журналістыкі гатовы адразу ўзяць на пасаду галоўнага рэдактара. Некалькі гадоў таму пайшла тэндэнцыя адкрываць аддзяленні журналістыкі ці літаратурнай работы ў рэгіянальных універсітэтах — гэта не вырашае праблемы. У рэгіёнах няма столькі спецыялістаў, каб якасна навучыць будучых журналістаў. Думаю, з цягам часу адзінай кузняй журналісцкіх кадраў у краіне стане наш факультэт.

Мы рыхтуем кадры для краіны з 1944 г., і за гэтыя гады ўжо сфарміраваўся касцяк вучоных у галіне журналістыкі, ёсць свае традыцыі на факультэце, свае школы. І няма ў краіне іншага падраздзялення, здольнага забяспечыць падрыхтоўку журналісцкіх кадраў на больш высокім узроўні.

Цяпер мы з Міністэрствам інфармацыі павінны звярнуць увагу на мэтавую падрыхтоўку журналісцкіх кадраў для рэгіёнаў Беларусі. Асабліва для раёнаў, якія пацярпелі ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Там жывуць людзі. Мы не павінны пра гэта забываць. Сёння рыхтаваць журналістаў толькі дзеля падрыхтоўкі — не дзяржаўны падыход. Іх трэба навучаць (асабліва на бюджэтнай форме навучання), каб яны ішлі працаваць туды, дзе іх найбольш чакаюць.

— Што Вы можаце параіць абітурыентам, якія мараць вучыцца на факультэце журналістыкі?

— Журналістыка — самая цікавая і перспектыўная спецыяльнасць. На факультэце журналістыкі наўрад ці навучаць пісаць, таму што гэтая здольнасць — як іскра Божая: альбо ёсць, альбо няма. Але пасля заканчэння факультэта чалавек, па меншай меры, выйдзе падрыхтаваным спецыялістам. Тым маладым людзям, якія вырашылі звязаць свой лёс з журналістыкай, хачу параіць як мага раней пачынаць ісці па гэтай дарозе: рыхтаваць матэрыялы, супрацоўнічаць з газетамі, часопісамі. Ведаю па сабе: калі чалавек чытае сваё прозвішча надрукаваным у газеце, яго ахопліваe асаблівае пачуццё ўсведамлення нейкага свайго прызнання, павагі да газеты. Той, хто паспытаў гэтага хлеба, гэтай цікавай працы, наўрад ці пашкадуе, што абраў гэтую прафесію. Талковы журналіст ніколі не будзе без працы і заўсёды будзе запатрабаваны. Самае галоўнае для пачынаючых журналістаў — мабыць, удача. А ўдача прыходзіць толькі да таго, хто ідзе ёй насустрач.

Гутарыла Таццяна КАЗАК
Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ

ПОМНІКІ БДУ

Полацкая асветніца

Першай вялікай сейбіткай духоўнага зерня, духоўнай культуры на беларускай зямлі стала княжна Прадслава з Полацка — святая Еўфрасіння, якая прысвяціла гэтай справе ўсё сваё жыццё, усе свае здольнасці і сілы.

Паміж нашым часам і эпохай, калі жыла і працавала знакамітая палачанка, ляжыць больш за восем стагоддзяў. Гісторыя данесла да нас не надта багатыя звесткі пра яе. Асноўная біяграфічная крыніца інфармацыі пра асветніцу — "Жыціе Еўфрасінні Полацкай". Гэты твор невядомага аўтара (магчыма, манаха або ігумена аднаго з полацкіх манастыроў) узнік у канцы XII ст. у Полацку. Але каб найбольш поўна ўзнавіць жыццёвы шлях Еўфрасінні, "Жыціе" трэба вывучаць у сукупнасці з іншымі крыніцамі: усходнеславянскімі летапісамі, візантыйскімі хронікамі. Цікавыя звесткі пра асветніцу ёсць у прысвечаным ёй спеўным цыкле XII ст.

У эпоху гэтай славутай жанчыны Полацк быў найбуйнейшым горадам Беларусі. З глыбокай старажытнасці ён славіўся як цэнтр рамёстваў і гандлю. Эканамічны ўзлёт Полацкай зямлі суправаджаўся значнымі дасягненнямі ў галіне культуры. У сярэдзіне XI ст. на беразе Дзвіны быў пабудаваны велічны Сафійскі сабор, шэраг іншых храмаў. У гэты ж час у Полацку пачынаюць працаваць першыя школы і вучылішчы.

Заахвочваў усебаковае развіццё культуры і князь Святаслаў (у хрысціянстве Георгій). Менавіта ў яго сям'і каля 1104 г. і нарадзілася дачка, якой наканавана было стаць адной з самых славутых гераінь нашай старажытнай гісторыі. Нованароджаная атрымала язычніцкае імя Прадслава.

Бацькі імкнуліся даць дзяўчынцы добрае хатняе выхаванне, у тым ліку і навучыць грамаце, што тады сярод жанчын было надзвычайнай рэдкасцю. Ужо ў ранім дзяцінстве Прадслава валодала так званым "кніжным пісаннем" (яно ўключала чытанне, пісьмо, лік, спевы, а таксама грэчаскую і лацінскую мовы). У працэсе навучання дзяўчынка выявіла значныя здольнасці. Акрамя дзіўнай адоранасці яна ўражвала ўсіх незвычайнай прыгажосцю.

Пра тое, што ў полацкага князя расце прыгожая і мудрая дачка, хутка стала вядома далёка па-за межамі Полацкай зямлі. Пачалі з'язджацца сваты. Даведаўшыся, што яе хочуць заручыць з маладым князем, Прадслава таемна ад бацькоў пайшла ў манастыр, дзе ігуменняй была яе цётка, і вырашыла прыняць пострыг. Шкадуючы прыгажосць сваёй пляменніцы і баючыся гневу свайго брата, ігумення спачатку выказалася супраць гэтага намеру. Але рашучасць Прадславы перамагла: каля 1116 г. яна прыняла пострыг, атрымаўшы імя Еўфрасінні. Можна меркаваць, што гэтая падзея адбылася 25 верасня — у дзень святой Еўфрасінні Александрыйскай.

Учынак княжны можна растлумачыць не толькі жаданнем правесці жыццё ў малітвах, але і памкненнем прысвяціць сябе асветніцкай дзейнасці. Гэты занятак вабіў яе з маленства, а манастыр у той час быў адзіным сродкам для дасягнення такой мэты.

Пасля пострыгу Еўфрасіння пасялілася пры Сафійскім саборы і там цалкам аддалася самаадукацыі: чытанню, роздуму, малітвам. З цягам часу манахіня сфарміравала багаты кнігазбор, які стаў асновай для унікальнай бібліятэкі Сафійскага сабора.

Еўфрасіння Полацкая занялася адным з самых складаных рамёстваў таго часу, якое патрабавала значнай адукаванасці, цярплівасці і мастацкіх навыкаў, — перапісваннем кніг. Частка кніг, перапісаных Еўфрасінняй, легла ў аснову манастырскіх бібліятэк. Іншыя кнігі ішлі на продаж, а атрыманыя грошы раздавалі бедным.

Займалася Еўфрасіння і перакладам рэлігійна-філасофскай літаратуры з грэчаскай і лацінскай мовы на старажытнаславянскую, чым значна ўзбагаціла духоўную культуру нашага народа.

Як сведчыць "Жыціе", яна пісала і ўласныя творы — малітвы, казанні. Іх стыль вылучаецца яркасцю і сведчыць пра літаратурныя здольнасці аўтаркі.

Яшчэ адной мэтай і марай асветніцы была педагагічная дзейнасць, навучанне простага люду грамаце, стварэнне вучылішчаў і школ. У школах манахіня імкнулася пашырыць межы звычайнай навучальнай праграмы. Дзеці вывучалі дадаткова грэчаскую і лацінскую мовы, асновы прыродазнаўства, рыторыкі, гісторыі. Школы, заснаваныя Еўфрасінняй Полацкай, былі перадавымі для свайго часу: значная частка вучняў набіралася з простага люду.

Школы дзейнічалі пры манастырах, заснаваных таксама з

ініцыятывы Еўфрасінні. З імем асветніцы асацыіруюцца два манастыры. Першы, жаночы пры царкве Святога Спаса ў Полацку, быў заснаваны каля 1128 г. З яго з'яўленнем звязана паданне. Еўфрасіння неяк убачыла сон: анёл узяў яе за руку і адвёў у Сяльцо, недалёка ад Полацка, дзе былі драўляная царква Спаса і мураваны храм-пахавальня полацкіх епіскапаў. Анёл сказаў Еўфрасінні: "Тут належыць быць табе!" Гэты дзіўны сон паўтарыўся яшчэ двойчы. У тую ноч такі ж сон бачыў полацкі епіскап. Пасля гэтых падзей епіскап аддаў Сяльцо, дзе Еўфрасіння і заснавала манастыр. Праз нейкі час яна стварыла яшчэ адзін манастыр — мужчынскі пры царкве Багародзіцы, месцазнаходжанне якога сёння дакладна не вядомае.

У гэтых манастырах пад кіраўніцтвам Еўфрасінні Полацкай працавалі скрыпторыі — майстэрні па перапісванні кніг. Тут існаваў падзел працы, што значна павялічвала не толькі колькасць кніг, але і іх мастацкі ўзровень. Са скрыпторыяў кнігі траплялі ва ўсе куткі Полацкай зямлі і за яе межы. Заснаванне манастыроў, педагагічная дзейнасць Еўфрасінні далі магутны штуршок развіццю і пашырэнню школьнай справы і адукацыі на беларускіх землях.

З імем Еўфрасінні Полацкай звязана таксама будаўніцтва храмаў у Беларусі. Калі яна стала ігуменняй манастыра, то вырашыла замест старой драўлянай царквы пабудаваць каменны сабор, які ўзвялі за адзін будаўнічы сезон (прыкладна 30 тыдняў). Храм уражвае сваёй зграбнасцю і прыгажосцю. Спасаўская, або Спаса-Прэабражэнская, царква лічыцца сапраўднай вяршыняй дасягненняў полацкіх дойлідаў таго часу. Яе сцены ўпрыгожвалі выдатныя фрэскі, распісаныя полацкімі мастакамі XII ст. Навукоўцы лічаць, што адна з гэтых фрэсак паказвае саму Еўфрасінню.

Вялікую каштоўнасць меў змешчаны ў Спасаўскай царкве абраз Божай Маці, які напісаў, паводле падання, евангеліст Лука. Карыстаючыся сваяцтвам з візантыйскім імператарскім домам, Еўфрасіння звярнулася да імператара Мануіла Комніна і патрыярха Лукі Хрысаверга з просьбай даслаць ёй абраз Багародзіцы Эфескай — адзін з трох, якія напісаў евангеліст Лука. У 1162 г. абраз апынуўся на Русі, каля года ён прабыў у Херсанесе, а затым прыбыў у Полацк. Сёння абраз знаходзіцца ў Рускім музеі Санкт-Пецярбурга.

Скончыўшы будаўніцтва Спасаўскай цаквы, Еўфрасіння распачала ўзвядзенне новага храма — царквы Святой Багародзіцы, пры якой з'явіўся мужчынскі манастыр.

З імем Еўфрасінні Полацкай непасрэдна звязаны таксама шэдэўр ювелірнага мастацтва — знакаміты крыж, створаны полацкім майстрам Лазарам Богшам. Выкананая для ігуменні Спаскага манастыра ў 1161 г. рэліквія была каўчэгам для захавання атрыманых з Канстанцінопаля хрысціянскіх святыняў. Крыж Еўфрасінні Полацкай ёсць адначасова і каштоўным помнікам старажытнабеларускай пісьмовасці. Сёння лёс крыжа невядомы: ён быў скрадзены.

Пад канец жыцця Еўфрасіння здзейсніла паломніцтва ў Іерусалім. Там, на Святой Зямлі асветніца захварэла і 23 мая 1173 г. памерла. Пахавалі яе ў іерусалімскім манастыры святога Феадосія. Толькі ў наш час рака з мошчамі святой была вернута ў Спасаўскую царкву. Пасля смерці святасць Еўфрасінні прызналі і праваслаўная, і каталіцкая цэрквы. Аднак палачане яшчэ да таго, даведаўшыся пра смерць асветніцы і не чакаючы афіцыйнай кананізацыі, абвясцілі яе святой і пачалі святкаваць дзень яе памяці 23 мая (па новым стылі — 5 чэрвеня).

Без імя Еўфрасінні Полацкай, якая стала першай жанчынай, кананізаванай праваслаўнаю царквою, немагчыма ўявіць шматвяковую гісторыю Беларусі. Багаты плён яе працы высока ўзняў аўтарытэт Полацкага княства ў вачах іншых краін. Дзейнасць Еўфрасінні Полацкай натхніла паслядоўнікаў — друкара Францішка Скарыну, перакладчыка і выдаўца Евангелля Васіля Цяпінскага, паэта і асветніка Сімяона Полацкага.

Ганна ФЯДЗЯЕВА
Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ

ПОМНІК ЕЎФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ

Неўзабаве пасля ўстаноўкі помнікаў Францыска Скарыны і Міколы Гусоўскага з'явілася ідэя паставіць помнік і вялікай беларускай асветніцы, нябеснай заступніцы як праваслаўных, так і католікаў Беларусі — Еўфрасінні Полацкай. Скульптурная работа была даручана Ігару Голубеву. Тэксты на помніку, шрыфты, агульную канцэпцыю помніка распрацоўваў Анатоль Белы. Архітэктурнай распрацоўкай п'едэстала займаўся Віктар Ягадніцкі.

Напрыканцы 1999 г. помнік быў адліты з бронзы і ўсталяваны на гранітным п'едэстале ў дворыку БДУ. 21 снежня 1999 г. адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця, на якой прысутнічалі кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, міністр культуры, рэктарат універсітэта, выкладчыкі, студэнты. Помнік Еўфрасінні Полацкай на той час быў першым у Беларусі. Толькі ў кастрычніку 2002 г. з'явіўся помнік Еўфрасінні Полацкай на яе радзіме — у Полацку, а пасля і ў Старых Дарогах у Музеі выяўленчага мастацтва.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

ПЕРАМОЖЦЫ З МЕХМАТА

Механіка-матэматычны факультэт зноў даказаў, якія таленавітыя студэнты з'яўляюцца яго навучэнцамі. Праект БДУ SIS (The Simple Integration System) быў прызнаны найлепшым у рамках конкурсу Cache' Innovator Award. Гэтае прэстыжнае міжнароднае спаборніцтва інавацыйных ІТ-рашэнняў адбываецца штогод, у ім прымаюць удзел ВНУ з розных краін свету. Беларусь упершыню на гэтым конкурсе атрымала першую прэмію, з чым і віншуем студэнтаў-прызёраў ды іх кіраўніка Аляксандра Мальковіча.

Некалькі гадоў Аляксей Мальковіч, Зміцер Сямернік, Генадзь Чэркес, Вадзім Кулінскі, Юрый Міцюшкоў, Алекс Перэз-Чарноў распрацоўвалі пад кіраўніцтвам Аляксандра Мальковіча (пры падтрымцы Андрэя Шавеля) сістэму, якая здолела б вырашаць праблемы буйных дзяржпрадпрыемстваў па зборы і сістэматызацыі значных аб'ёмаў інфармацыі ў рэжыме рэальнага часу. Каб рэалізаваць ідэю, мусілі выкарыстоўваць шматмерныя базы даных Cache', што дазваляюць адначасова працаваць з вялікімі аб'ёмамі рознай інфармацыі і аб'ядноўваць мноства тэрытарыяльна разнародных сістэм.

На факультэце пра перамогу хлопцаў ведаюць мала. Намдэкана ММФ Дзмітрый Мядзведзеў тлумачыць гэта так: "Праектаў у нас розных шмат, кожны цікавіцца сваім... Пра свой поспех на Cache' Innovator Award пераможцы спачатку нічога не казалі: мабыць, баяліся "сурочыць", — а пасля, відаць, у іх ужо не было часу..."

Цяпер час ужо знайшоўся, і кіраўнік праекта Аляксандр Мальковіч пагадзіўся адказаць на пытанні "Беларускага універсітэта":

— Праект вашых студэнтаў быў прызнаны найлепшым. Гэта нечаканы поспех ці заканамерны вынік карпатлівай працы?

— У гэтым годзе ў конкурсе ўдзельнічалі 210 універсітэтаў з 30 краін, у фінал выйшлі 11 работ. Першае месца — гэта прыемная нечаканасць і, хочацца думаць, для нас заканамерная.

— Ці дае студэнтам перамога што-небудзь, акрамя пачуцця гонару?

— Упэўненасць у сваіх ведах і магчымасцях, а яшчэ прызнанне іх нялёгкай работы. Прапановы, якія цяпер ідуць ад заказчыкаў.

— Студэнты-прызёры працуюць над адаптацыяй сваёй сістэмы для беларускіх прадпрыемстваў?

— Так, сёння гэта фабрыка "Камунарка", потым, спадзяемся, будзе МАЗ: там наша сістэма паспяхова функцыянуе на працягу 5 гадоў, зоймемся яе ўдасканаленнем. А вось размеркавальная сістэма выдачы і кантролю дазволаў на ўвоз-вываз прадукцыі, падкантрольнай Дзяржветнагляду Беларусі, — «БУГ», распрацаваная спецыяльна для гэтай арганізацыі на базе SIS, на жаль, так і не выкарыстоўваецца, хаця спецыялісты ёю вельмі зацікавіліся на выстаўцы TIBO-2005.

— Збіраецеся ўдзельнічаць у конкурсе Cache' Innovator Award і надалей?

— Абавязкова, у наступным годзе плануем на конкурс прадставіць не менш за два праекты.

Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

3 чэрвеня 2005 года, № 12 (1920)

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

Английский язык: обучение устной речи. *Авторы-составители Н.Н. Нижнева, Л.А. Артеменко, А.И. Василевская, Л.С. Мезена.* У навучальным дапаможніку, прызначаным для студэнтаў, якія вывучаюць англійскую мову як другую замежную, уключаны тры раздзелы "Family", "Appearance", "Home" з тэматычным слоўнікам, практыкаваннямі, тэкставым матэрыялам, з заданнямі і тэкстамі для дадатковага чытання.

Cross-cultural communication: reading, speaking, writing, listening. У навучальным дапаможніку (першае выданне якога выйшла ў 2003 г.)

змяшчаюцца тэксты культуразнаўчай тэматыкі, а таксама сістэма практыкаванняў, скіраваная на развіццё навыкаў сэнсавага ўспрыняцця аўтэнтычнага англійскага тэксту.

Л.Д. Бурко, А.В. Балаш, Н.Е. Бурко. **Зоология позвоночных.** У практыкуме для студэнтаў біялагічнага факультэта разглядаюцца марфалагічныя асаблівасці прадстаўнікоў розных груп хордавых жывёлаў, іх вонкавая і ўнутраная будова.

Т.В. Купчинова. **Организационная структура.** Вучэбна-метадычны комплекс для студэнтаў факультэта філасофіі паказвае розныя падыходы да вывучэння феномена арганізацыйнай структуры.

В.И. Яшкин. **Краевые задачи в микроэлектронике.** У вучэбным дапаможніку разглядаюцца аналітычныя і лікавыя падыходы да вырашэння краявых задач, якія паказваюць матэматычныя мадэлі розных працэсаў мікраэлектронікі.

В.И. Дунай, А.Н. Антоненко, Б.В. Лысый. **Сердечно-сосудистая система человека.** У дапаможніку можна знайсці звесткі па анатоміі і фізіялогіі сардэчна-сасудзістай сістэмы чалавека, а таксама матэрыял для выканання лабараторных (практычных) работ.

Тестовые задания по грамматике английского языка. Зборнік, складзены з трох частак, мае тэставыя заданні, адпаведныя праграме I—III курсаў факультэтаў замежных моваў ВНУ.

Английский язык: Обучение устной речи. Навучальны дапаможнік уключае тэматычны слоўнік, практыкаванні, тэкставы матэрыял з заданнямі і тэксты для дадатковага чытання.

Английский язык: Тексты для чтения, задания. Дапаможнік, які складаецца з 6 урокаў, мае тэставы матэрыял, актыўную лексіку і разнастайныя практыкаванні, скіраваныя на замацаванне лексікі, развіццё навыкаў вуснага маўлення, пераказу, творчых і аналітычных здольнасцей.

Тренинг по аудированию. У вучэбна-метадычны дапаможнік увайшлі 46 тэкстаў, якія суправаджаюцца заданнямі і практыкаваннямі, даюць студэнтам магчымасць зразумець структуру тэксту, асноўны сэнс і змест.

Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

ВЯЛІКІ "КОШЫКБОЛ" НА ФІЛФАКУ

На філалагічным факультэце існуе даўняя традыцыя праводзіць баскетбольныя матчы паміж выкладчыкамі і студэнтамі. 19 мая адбылася чарговая сустрэча, якая выклікала вялікую цікавасць з боку студэнтаў і выкладчыкаў: у спартыўнай зале, як і заўсёды, не было вольнага месца.

Матч нагадваў сапраўднае шоу: яго распачаў намеснік дэкана С.А. Важнік, які прадставіў каманды і суддзю, пасля чаго прапанаваў капітанам выцягнуць назву сваім камандам. Зборная выкладчыкаў займела назву "Ума Турман-2", а зборная студэнтаў — "Ачмурэлыя пінгвіны".

Падчас урачыста-жартоўнага прывітальнага слова былі ўганараваны ветэраны каманды. Прафесару Б.Ю. Норману прысвоена званне "Заслужаны баскетбаліст факультэта" і ўручаны нашыйны ордэн "За палявыя заслугі". Дацэнт У.Г. Будай узнагароджаны залатым яйкам з надпісам "Будай зэ бэст, Будай фарэва чэмпіён". Паэту Андрэю Хадановічу прэзентаваны асабісты кошык, каб лепш пісаліся лімерыкі і каб ён ніколі не забываўся на вялікі кошыкбол. За асабісты ўклад у развіццё кошыкбола на філалагічным факультэце БДУ памятным медалём "Залаты алень" адзначаны генеральны спонсар матча Максім Табораў.

Склад зборнай выкладчыкаў уражваў. За каманду "Ума Турман-2" выступалі прафесар Б.Ю. Норман, дацэнты У.Г. Будай, С.А. Важнік, ст. выкладчык А.Б. Шостак, выкладчыкі А.І. Копач, А.В. Хадановіч, С.А. Сматрычэнка, "гуляючы" спонсар зборнай, выпускнік філфака, дырэктар выдавецкага дома "Турінфа" М.В. Табораў. Вёў каманду выкладчыкаў наперад дэкан філфака прафесар І.С. Роўда, які прынёс сваёй камандзе 10 ачкоў. Паказальна, што кіраўніцтва факультэта на чале з дэканам актыўна прымае ўдзел не толькі ў арганізацыі такіх мерапрыемстваў, але і ў іх правядзенні, з'яўляючыся добрым прыкладам для студэнтаў. Зборная студэнтаў выступала ў наступным складзе: Сяргей Лазараў (III курс рускай філалогіі), Віталь Яцэнка (V курс славянскай філалогіі), Андрэй Кацуба (V курс нямецкай філалогіі), Аляксей Талалаў (V курс рускай філалогіі), а таксама прызнаныя лідэры каманды і зборнай універсітэта Мікалай Баранаў (III курс рускай філалогіі) і капітан каманды Павел Капанскі (I курс славянскай філалогіі). Матч праводзіў суддзя рэспубліканскай катэгорыі А.В. Дыдзік.

Падчас перапынкаў выступалі зборная філфака па спартыўнай аэробіцы (дарэчы, філалагіні занялі першае агульнакаманднае месца ва універсітэцкай спартакіядзе 2004-2005 навучальнага года), а таксама "брэйк-дансавая" зорка філфака Алег Усаў.

Гульня была роўная, аднак у асобныя моманты відавочна дамінавалі студэнты, перадусім дзякуючы праходам і кідкам з-за чырвонай лініі Мікалая Баранава і Паўла Капанскага. Нельга казаць, што студэнты былі на галаву мацнейшыя за выкладчыкаў, пра што сведчыць і канчатковы лік матчу: 71—64 на карысць "Ачмурэлых пінгвінаў". Яны і атрымалі галоўны прыз — пераходны Кубак філалагічнага факультэта, а таксама індывідуальныя прызы і баскетбольны мяч.

Адным словам, усе на кошыкбол! Матч адбудзецца пры любым надвор'і...

С.А. ВАЖНІК,
намеснік дэкана
філалагічнага факультэта

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

САМЫЯ ЎТУЛЬНЫЯ

Штогод у студэнцкім гарадку адбываецца агляд-конкурс "Найлепшы пакой інтэрната БДУ". 12 мая камісія, у якую ўвайшлі прадстаўнікі Савета па прафілактыцы і Каардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ, а таксама метадычнага цэнтра на чале з намесніцай дырэктара студгарадка В.П. Яраш, вызначыла найлепшыя пакоі ўсіх 9 студэнцкіх інтэрнатаў нашага універсітэта.

"Спярша прывядзі да ладу свой пакой, а ўжо потым бярыся за астатні свет", — відаць, гэтым вядомым выслоўем карыстаюцца мэтанакіраваныя, амбітныя ў сваіх жыццёвых планах студэнты БДУ. Пры вызначэнні найлепшага пакоя ўлічвалася выкананне санітарна-гігіенічных нормаў, правілаў супрацьпажарнай бяспекі, мастацка-эстэтычнае афармленне пакоя. Значная ўвага надавалася таксама ўдзелу прэтэндэнтаў у грамадскім жыцці інтэрната і студэнцкага гарадка.

Многія пакоі здзівілі дызайнерскімі рашэннямі, у нечым нават прэтэнзіяй на вырашэнне "кватэрнага пытання": студэнтам на 12—18 кв. м даводзіцца ўлічваць інтарэсы 3—4 чалавек, арганічна і функцыянальна афармляючы пакой з выкарыстаннем стандартнай мэблі інтэрната. Менавіта тыя, хто спалучыў у сваім пакоі ўтульнасць, функцыянальнасць і камфорт, атрымалі званне найлепшых: інтэрнат № 1 — 211а, № 2 — 1007б, № 3 — 1307а, №4 — 406, № 5 — 409, № 6 — 1006, № 7 — 415а, № 9 — 49, № 10 — В113. Спадзяемся, што каштоўныя падарункі ад ГА "Апякунскі савет студэнцкага гарадка БДУ" паспрыяюць стварэнню гасціннай атмасферы ў студэнцкіх "дамах", дзе жывуць узаемаразуменне і прыгажосць.

Людміла БІЛЬДЗЮГ

КОНКУРСЫ

"ВАЕННЫЯ" НАСЦЕНГАЗЕТЫ

60-годдзю Перамогі быў прысвечаны конкурс насценгазет і плакатаў, арганізаваны Студэнцкім саюзам БДУ і ўпраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю. Усе факультэты прынялі ў ім актыўны ўдзел.

"Вечная памяць тым, хто загінуў за незалежнасць Радзімы! Нізкі паклон тым, хто выжыў!" — такімі настроямі прасякнуты насценгазеты. У шмат якіх з іх паказваюцца матэрыялы, што адлюстроўваюць паходы студэнтаў па мясцінах баявой славы.

Найлепшай насценгазетай журы (пад кіраўніцтвам начальніка ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю П.В. Скалабана) назвала газету Інстытута тэалогіі, зробленую Марыяй Гіравай і Марыяй Сушчых. Сярод плакатаў найлепшым, на думку журы, быў "Мірны атам", зроблены студэнткай фізічнага факультэта Надзеяй Снытко. Пераможцы атрымалі дыпломы Студэнцкага саюза, прэміі, а таксама бясплатную экскурсійную паездку.

Студэнцкі саюз адзначыў падзякамі ўсіх, хто прыняў удзел у конкурсе. Асаблівую падзяку Студэнцкага саюза і ўпраўлення выхаваўчай работы з моладдзю атрымаў геаграфічны факультэт, які прадставіў на конкурс цэлую серыю работ і выставіў іх у сваім навучальным корпусе.

Святлана ДАЛГАНЮК

ПОСТФАКТУМ

"НАРОДНЫ АРТЫСТ" І ЎСЕ, УСЕ, УСЕ...

Цыкл канцэртаў, прысвечаных 60-годдзю з Дня Перамогі і арганізаваных упраўленнем выхаваўчай работы з моладдзю, упраўленнем па справах культуры і камітэтам БРСМ БДУ, завяршыўся толькі ў сярэдзіне мая. Удзельнікі выступілі ў вайсковых часцях Асіповічаў, п.Станькава, на канцэртных пляцоўках Мінска. Апошні канцэрт для ветэранаў далі 13 мая ў Шчамысліцкай школе. Нумары былі разнастайнымі: ад песень Вялікай Айчыннай вайны — да сучасных, ад народных беларускіх — да кампазіцый на англійскай мове. Непадробны інтарэс выклікаў удзел у праграме фіналіста расійскага тэлевізійнага праекта "Народны артыст" Дзмітрыя Калдуна (хімічны факультэт). Асабліва вызначыліся сольнымі нумарамі студэнты Ганна Мартынава (геаграфічны факультэт), Юлія Трыпуцька (філалагічны факультэт), Яўген Леўчанка (ваенны факультэт).

Святлана ДАЛГАНЮК

СПОРТ

АСІЛКІ З БДУ

У сярэдзіне мая на базе нашага універсітэта прайшла рэспубліканская універсіяда па гіравым спорце ў дваябор'і. Удзел у спаборніцтвах прынялі 122 прадстаўнікі 16 ВНУ Беларусі. У асабістым першынстве былі адзначаныя наступныя прадстаўнікі нашага універсітэта: М. Вісітаеў (II месца ў катэгорыі да 60 кг), І. Картэль (III месца ў катэгорыі да 90 кг), А. Кузінцоў (II месца ў катэгорыі звыш 100 кг). У эстафеце спартсмены БДУ набралі 238 ачкоў і занялі другое месца, саступіўшы толькі Мазырскаму дзяржаўнаму педагагічнаму універсітэту (242 ачкі).

Увогуле ж, трэба адзначыць, што гіравы спорт у БДУ развіваецца ўжо 20 гадоў. Тыя, хто адчувае да яго цікавасць, могуць звяртацца на кафедру фізвыхавання і спорту да В.С. Фралова.

Ірына ЗАЯЦ, студэнтка
факультэта журналістыкі

У ВОЛЬНЫ ЧАС

ДЗЕ ЖЫВЕ "НАТХНЕННЕ"

Вось ужо тры гады на базе інтэрната № 7 дзейнічае літаратурна-музычная гасцёўня "Натхненне". Вечарына, прысвечаная 60-годдзю Перамогі, называлася "Радавы беларускай паэзіі": падчас яе адбылася сустрэча з паэтам, удзельнікам вайны Міколам Аўрамчыкам. Сівы паэт натхнёна чытаў вершы, і ніхто не мог даць веры, што яму ўжо 85 гадоў. Потым удзельнікі літаратурна-музычнай вечарыны далі ў гонар госця невялікі канцэрт: выканалі вершы і песні ўласнага сачынення.

Астатнія пасяджэнні нашай гасцёўні былі таксама вельмі цікавымі. Досыць змястоўнай была праграма, прысвечаная 83-годдзю БДУ і 30-годдзю студгарадка. На заканчэнне сезона мы падрыхтавалі вялікую праграму "Вясна, вясна — пара кахання". Натхнёна гучалі вершы Шэкспіра, Пушкіна, Ясеніна, Блока, Ахматавай, Цвятаевай, сучасных беларускіх і расійскіх паэтаў. Напрыканцы вечарыны прагучала літаратурна-музычная кампазіцыя "Метамарфозы кахання" паводле твораў Бёрнса. Пасля гэтага пачалася забаўляльная праграма з нязменным "бурымэ", міні-КВЗ, літаратурнай віктарынай.

Г. МАХАЕВА, кіраўніца
літаратурна-музычнай
гасцёўні "Натхненне"
студэнцкага гарадка БДУ

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

3 чэрвеня 2005 года
Падпісана да друку 02.06.2005 г.
Зак. 471. Тыраж 1000 экз. Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by